

Другое жыццё культурных каштоўнасцяў

СТАР. 2



Сабраць дзіця ў аздараўленчы лагер

СТАР. 6



Кузьма Чорны — беларускі Дастаеўскі

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 107 (28217) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПЫТАННЕ БЯСПЕКІ І АЎТАРЫТЭТУ

## СНД павінна стаць палітычным і эканамічным цэнтрам сілы

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт на сустрэчы з кіраўнікамі дэлегацый, якія прымаюць удзел у XVI сесіі Савета кіраўнікоў вышэйшых органаў фінансавага кантролю дзяржаў — удзельніц СНД.**

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што неабходна больш поўна выкарыстоўваць магчымасці такога важнага інтэграцыйнага аб'яднання, як Садружнасць. Прэзідэнт звярнуў увагу на той факт, што апошнім часам адзначаюцца негатыўныя тэндэнцыі, разыходжанні паміж членамі СНД, жаданне некаторых з іх дыстанцыявацца ад якіх-небудзь абавязацельстваў і быць проста назіральнікамі, а то і зусім выйсці са складу арганізацыі. Нягледзячы на тое, што СНД у яе цяперашнім выглядзе і падвяргаецца крытыцы, беларускі бок лічыць, што патэнцыял супрацоўніцтва далёка не вычарпаны. На думку Аляксандра Лукашэнкі, неабходна надаць новы імпульс дзейнасці гэтай арганізацыі і ўзняць яе аўтарытэт на міжнароднай арэне.

Прэзідэнт перакананы, што органы фінансавага кантролю могуць сыграць адну з вядучых роляў у працэсе далейшага станаўлення СНД. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «ўпарадкаванне руху грошай і каштоўных папер, выкарыстанне іншых актываў на вялізнай частцы еўразійскага кантынента — гэта гарант стабільнасці і эканамічнай бяспекі нашых краін». На думку Аляксандра Лукашэнкі, толькі пры ўмове жорсткага дзяржаўнага кантролю за фінансавымі патокамі, строгага захавання законнасці ў гэтым сектары можна паспяхова развівацца. «Неабходна паставіць непераадольны заслон безгаспадарчасці, нямэтаваму выкарыстанню бюджэтных сродкаў, уцечцы капіталу за мяжу, незаконным валютным аперацыям, карупцыі і іншым негатыўным з'явам», — упэўнены Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што ў сучасных умовах найважнейшай задачай стратэгічнага значэння з'яўляецца ўзмоцненая каардынацыя дзеянняў кантрольных органаў краін СНД, а таксама выпрацоўка імі сумесных падыходаў да прадухілення фінансавых парушэнняў, абмен вопытам у засваенні новых метадаў работы. Гэта асабліва важна цяпер, калі свет адзін за адным скаланаюць крызісы, што самым неспрыяльным чынам адбіваецца на становішчы спраў у краінах Садружнасці. Гаворка ідзе пра бяспеку кожнай з дзяржаў Садружнасці паасобку і палітыка-эканамічнай моцы СНД у цэлым.

Удзельнікі сустрэчы пагадзіліся з важнасцю ролі эканамічнай бяспекі, якая ў сучасных умовах сапраўды набывае ўсё большае значэнне, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Тэмы, якія абмяркоўваліся, тычыліся глабальных пытанняў развіцця СНД, выяўлення болевых кропак дзейнасці арганізацыі і выпрацоўкі стратэгіі сумесных дзеянняў, у тым ліку ў пытаннях фінансавага кантролю, на бліжэйшую перспектыву.

Кіраўнікі вышэйшых органаў фінансавага кантролю краін Садружнасці пазітыўна ацанілі поспехі Беларусі ў пытаннях дзяржаўнага кантролю, а таксама ў цэлым развіцця краіны.

# БУДОЎЛЯ ВАМ ДА ТВАРУ!



Фота БЕЛТА.

**У невялікім райцэнтры Лёзна, што на Віцебшчыне, на самай мяжы з Расіяй, актыўна, як і па ўсёй краіне, узводзяцца новыя сучасныя будынкі. Да гэтай адказнай справы далучаюцца лепшыя спецыялісты. Напрыклад, Настасся СОБАЛЕВА за кароткі час асвоіла прафесію інжынера-будаўніка, цяпер ёй даяраюць самыя адказныя ўчасткі ў рабоце. Малады спецыяліст паедзе на Усебеларускі народны сход прадстаўляць свой рэгіён. А пакуль яна з калегамі-мужчынамі Дзмітрыем ВАЙЦЯХОЎСКІМ, Аляксандрам ВІНАГРАДАВЫМ і Максімам ШАЛУХІНЫМ абмяркоўвае вытворчыя пытанні.**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**$4 млрд 271,6 млн**

*у эквіваленце склалі золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 чэрвеня — за май яны павялічыліся на $43,1 млн. «Падтрыманню золатавалютных рэзерваў садзейнічалі паступленне сродкаў ад продажу Нацыянальным банкам і Міністэрствам фінансаў аблігацый, намініраваных у замежнай валюце, купля Нацбанкам замежнай валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы, а таксама паступленні ад спагнання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты», — растлумачылі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка. Адмоўны ўплыў на аб'ём золатавалютных рэзерваў у асноўным аказала пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19850,00 | ▼ |
| Еўра | 22559,00 | ■ |
| Рас. руб. | 304,05 | ▲ |
| Укр. грыўня | 795,03 | ▼ |

■ Сябруем рэгіёнамі

# КАНТРАКТАЎ — НЕ МЕНШ ЧЫМ НА $300 МЛН

## У сталіцы пачаў работу трэці Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі

**Нягледзячы на тое, што пакуль гэта мерапрыемства не мае шматгадовай гісторыі, Форум ужо зараз прыцягвае ўвагу бізнесменаў і палітыкаў абедзвюх краін. Паўдзельнічаць у ім прыехалі прадстаўнікі каля 40 расійскіх рэгіёнаў.**

### УДЗЕЛЬНІКАЎ — УДВАЯ БОЛЬШ

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** падчас сустрэчы са сваёй калегай — **Валянцінай МАЦВІЕНКАЙ, спікерам Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі**, звярнуў увагу: на першы Форум рэгіёнаў, які таксама праходзіў у нашай краіне, прыехалі прадстаўнікі 19 расійскіх рэгіёнаў. Сёлета — удвая больш — прагрэс відавочны.

— Акрамя тых 39 пагадненняў, якія плануецца прыняць, вельмі вялікі камерцыйны складнік, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Мы лічым, што экспартна-імпартных кантрактаў будзе падпісана не менш чым на $300 млн.

На яго думку, гэта сведчыць аб дастаткова высокім базісе ў гандлёва-эканамічнай сферы, а таксама аб тым, што рэзервы ёсць і іх можна нарошчваць. Спікер верхняй палаты запэўніў, што беларускім і расійскім бакамі будуць прыняты максімальныя намаганні для таго, каб апраўдаць чаканні ад Форуму.

— Для нас высокі гонар і адказнасць, што ўдзел у ім прымаюць прэзідэнты Беларусі і Расіі, — асобна заўважыў ён. СТАР. 2

■ Здаёмся!

# РЭПУТАЦЫЯ ЦТ ДАРАГОГА КАШТУЕ,

## або Усё, што вы хацелі ведаць пра цэнтралізаванае тэсціраванне



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**У 2016 годзе, па прагнозах расійскіх экспертаў, выдаткі дзяржавы на правядзенне адзінага дзяржаўнага экзамену (АДЭ) складуць рэкордную суму — 2 млрд рублёў. Каб папярэдзіць магчымую ўцечку інфармацыі з экзаменацыйных аўдыторый, для апошніх набываюцца сістэмы відэаназірання (а па краіне задзейнічана 59 тысяч аўдыторый). На ўваходах у навучальныя ўстановы ўстанаўліваюцца металічныя рамкі. За парадкам на экзамене праз інтэрнэт сочаць анлайн-наглядальнікі.**

### Сачыненне замест АДЭ?

Ці не таму паведамленне пра тое, што ў Дзярждуму паступіў законапраект аб адмене адзінага дзяржаўнага экзамену, многія ўспрынялі з недаверам. Усё ж столькі грошай і працы ўкладзена ў агульную справу! Але пазней інфармацыя знайшла пацвярджэнне: як высветлілася, заканадаўчы сход Карэліі прапанаваў зрабіць АДЭ па рускай мове добраахвотным і адмяніць адзіны дзяржаўны экзамен па матэматыцы на базавым узроўні. СТАР. 3

■ Ёсць пытанне!

# ГРОШЫ КАПАЛІ З-ПАД КРАНА

## Магілёўскі пенсіянер Васіль Лявоненка лічыць, што камунальнікі... перашкаджаюць яму эканоміць ваду



**Васіль Паўлавіч спадзяецца, што пытанне вырашаць на дзяржаўным узроўні.**

— Не буду плаціць за чыюсьці безгаспадарчасць, — заяўляе ён з парога і дэманструе цэлы стос афіцыйных папер. — Гэта ўсё адпіскі, а справай ніхто займацца не хоча.

Васіль Лявоненка жыве ў Магілёве ў доме па Пушкінскім праспекце на апошнім — 9-м паверсе. Праблема ў тым, што гарачая вада ў яго кран паступае не адразу — прыходзіцца спачатку некалькі літраў халоднай зліваць. Заяўнік сведчыць, што ўрэзка ў трубу, па якой ідзе гарачая вада, у яго санвузле знаходзіцца зверху, у той час як на астатніх паверхах — знізу. Там усё ў парадку: людзі ўключылі гарачую ваду — адразу карыстаюцца. А вось у Лявоненкі і тых, хто жыве на адной з ім пляцоўцы, праблема. Каб вада прагрэлася да сацыяльнага нарматыву — плюс 50 градусаў, трэба літраў 5-6 зліць.

— Так было з 1979 года, калі дом здалі, — сведчыць заяўнік. — Раней, калі вада лілася ракой, на гэтую акалічнасць увагі не звярталі. А цяпер прыборы лічаць кожны літр. Я плачу з разліку, што яна плюс 50 градусаў, а атрымліваю халодную, — абураецца ён. СТАР. 3

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### На вучэннях НАТА адпрацоўваюць абарону ад нападу на краіны Балтыі і Польшчу

У Польшчы 7 чэрвеня пачалася практычная фаза вучэнняў НАТА пад кодавай назвай «Анаконда-2016». Яны працягнуцца да 17 чэрвеня. Адной з першых аперацый стане высадка на палігон паблізу горада Торунь каля дзвюх тысяч польскіх, амерыканскіх і брытанскіх дэсантнікаў разам з гаўбіцамі, транспартнымі сродкамі і абсталяваннем. Сцэнарый вучэнняў уяўляе з сябе патэнцыйны канфлікт паміж двума ўмоўнымі альянсамі. У адзін з іх уваходзіць сама Польшча, краіны Балтыі і некалькі іншых рэальных дзяржаў, а ў другі — выдуманыя краіны Ботнія, Тарыке і Ліндсі. Паводле сцэнарыя падчас канфлікту адбываецца дэстабілізацыя сітуацыі ў Балтыйскім рэгіёне, уварванне сіл саперніка ў краіны Балтыі і Польшчу і анексія тэрыторыі.

### Ахвярамі тэракта ў Стамбуле сталі 11 чалавек



У Стамбуле прагрымеў выбух побач з аўтобусным прыпынкам, паведамляе CNN Turk. У выніку тэракта загінулі 11 чалавек, каля 36 атрымалі раненні. Паводле слоў губернатара рэгіёна Васіпа Шахіна, сямёра загінулых былі паліцэйскімі. Інцыдэнт адбыўся ў час пік у квартале Везнеджылер недалёка ад адной са стамбульскіх ВНУ. Мяркуецца, што была падарваная бомба з дыстанцыйным кіраваннем, мішэнню тэракта быў паліцэйскі аўтобус. Адказнасць за тое, што адбылося, на сябе пакуль ніхто не ўзяў.

### Аўстралія прыдумала, як пазбегнуць з'яўлення новых курцоў

Гэта першая краіна, дзе ўступіў у сілу закон аб забароне брэндавых пачкаў цыгарэт. З 1 снежня 2012 года ўсіх вытворцаў тытуню ў Аўстраліі абавязалі прадаваць сваю прадукцыю ў аднолькавай упакоўцы, 75% якой займаюць карцінкі з папярэджаннямі пра шкоду курэння. Марку цыгарэт паказваюць унізе пачка дробным шрыфтам. А нядаўна міністр аховы здароўя аўстралійскага штата Квінсленд Кэмеран Дзік падтрымаў ідэю Савета па раку аб увядзенні пажыццёвай забароны на курэнне для людзей, народжаных пасля 2001года, паведамляе «Vademecum».

ISSN 1990 - 763X

16107>

### КОРАТКА

Адным з варыянтаў вырашэння сітуацыі з бежанцамі можа стаць план Еўракамісіі заключыць партнёрскія пагадненні з дзевяццю краінамі Афрыкі і Блізкага Усходу. На фінансаванне такой ініцыятывы могуць быць выдзелены дзясяткі мільярдаў еўра.

**У Беларусі ў студзені—маі гэтага года адкрыты 7 744 дэпазітныя рахункі на сямейны капітал у «ААБ Беларусбанк» на суму $77,44 млн. Усяго на 1 чэрвеня 2016 года адкрыта 19 326 рахункаў на суму $193,26 млн.**

У Беларусі на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне насельніцтва, якое пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, у гэтым годзе накіроўваецца Br720,4 млрд.

**Фінал нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь-2016» адбудзецца 19 чэрвеня ў Палацы спорту. За галоўны тытул пазмагаюцца 26 прыгажунь.**

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

# ПРА ШТО ПЫТАЦЦА Ў ДЗІЦЯЦІ, ЧЫТАЙЦЕ Ў ГАЗЕЦЕ...



**Прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Мікалай ЗАПРУДСКІ:**

— Да «Звязды» я прыйшоў праз адукацыйныя артыкулы. Прыемна, што калектыў рэдакцыі разумее, што будучыня краіны ў многім залежыць ад школы, ад таго, чаму і як вучаць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Таму чытачы маюць магчымасць далучыцца да праблем сучаснай школы, пачытаць думкі, якія выказваюць прафесіяналы, паглядзець, у якіх кірунках развіваецца перадавая практыка, убачыць, што ёсць педагогі, якія працуюць і развіваюцца адпаведна сусветным адукацыйным тэндэнцыям. Нам не патрэбна самаізаляцыя, настальгія па-мінулым, якое не вернеш...

Менавіта наша «Звязда» адной з першых «адкрыла» вельмі актуальную тэму медыяадукацыі. Не толькі педагогі, але і людзі іншых прафесій, пенсіянеры даведаліся пра неабходнасць выпрацоўкі ў сябе і ў падрастаючага пакалення крытычнага мыслення, якое з'яўляецца фільтрам у інфармацыйных патоках і дазваляе чалавеку разбірацца, дзе праўда, а дзе маніпуляцыя свядомасцю, і на гэтай аснове будаваць свае стратэгіі паводзін.

Газета не аднойчы знаёміла чытачоў праз артыкулы, рэпартажы з «круглых сталоў» з актыўнай ацэнкай — новай для нашай краіны тэхналогіяй навучання. Тэхналогіяй, якая ўключае дзяцей у актыўную дзейнасць, робіць іх адказнымі, матываванымі, дапамагае ім вучыцца, далучае бацькоў да адукацыйнага працэсу. Менавіта з газеты многія з іх даведаліся, што шкодна пытацца ў сына ці дачкі, якія прыйшлі са школы, што ты сёння атрымаў? Трэба пытацца, чаму ты навучыўся, што было цікавага, у чым сабой задаволены і чаму? Ці было табе сёння сорамна, што цябе здзівіла і г.д.

Ужо гэтыя прыклады сведчаць, што «Звязда» асвятляе вельмі актуальную адукацыйную тэматыку. І, канешне, я не магу не падтрымаць адданасць журналістаў «Звязды» роднай мове. Для мяне мова — неад'емная частка майго жыцця. Таму хацелася б, каб кола прыхільнікаў і беларускай мовы, і беларускамоўнай газеты пашыралася...

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!